Падтрымай "Вясну" на PATREON

За слова "ўзурпатар" у адрас Лукашэнкі жыхара Баранавічаў асудзілі на 2 гады "хатняй хіміі"

31.05.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя



Ілюстрацыйнае фота

31 траўня суд Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы асудзіў 47-гадовага Вячаслаў Кульбу паводле абвінавачвання ў публічнай абразе прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 КК) на два гады "хатняй хіміі". Судовае пасяджэнне доўжылася адну гадзіну.

Справу вяла суддзя **Юльяна Шчэрба**. Бок дзяржабвінавачання прадстаўляла **Картыш**.

Абвінавачаны адмовіўся ад паслуг адваката, абараняў сябе сам.

Паводле абвінавачвання, Вячаслаў Кульба 20 лістапада 2020 года ў перыяд часу з 22.15 да 22.25 хвілін, "знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення на АЗС "Беларусьнефть" у прысутнасці аператараў АЗС Чычкан і Фурс, наўмысна, маючы мэту на публічную абразу дзейнага прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі,

усведамляючы зневажальны характар свайго выказвання, разлічваючы на тое, што ў наступным запіс стане даступны нявызначанаму колу асобаў, у кнізе заўваг і прапаноў АЗС уласнаручна пісьмова ўчыніў запіс, які змяшчае інфармацыю абразлівага характару: *"Скаргаў няма. Не разумею калектыў вашай АЗС, які падтрымлівае рэжым узурпатара Лукашэнкі"*.

Згодна з заключэннем эксперта судова-лінгвістычнай экспертызы, запіс у кнізе скаргаў мае выказванне, якім негатыўна ацэньваецца асоба, пазначаная з дапамогай намінацыі "Лукашэнка", тым самым абвінавачаны *"публічна прынізіў гонар і годнасць асобы дзеючага прэзідэнта, у сувязі з ажыццяўленнем ім сваіх паўнамоцтваў, выказанае ў непрыстойнай форме"*. На думку абвінавачання, сваімі дзеяннямі Вячаслаў Кульба здзейсніў злачынства па ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса.

Вячаслаў Кульба сваю віну прызнаў цалкам.

Абвінавачаны растлумачыў, што 20 лістапада выпіваў з прыяцелем, за ім заехала сястра, яны паехалі да маці і па дарозе заехалі на АЗС заправіцца. Калі запраўляў машыну, падалося, што *"пах бензіну нейкі не такі"*. Вячаслаў пайшоў за цыгарэтамі і пакінуў запіс у кнізе заўваг і прапаноў. Кажа, што паводзіў сябе адэкватна, проста падышоў і папрасіў кнігу скаргаў, вусных прэтэнзій не прад'яўляў. Таксама ён растлумачыў, што да гэтага запраўляўся ў Расіі, дзе працуе, і пераблытаў запраўкі, было вельмі дрэннай якасці паліва, пасля чаго давялося рабіць дарагі рамонт працоўнай машыны. Таму на запраўцы "Беларусьнефть" ў Расеі ён спытаў, хто кіраўнік сеткі АЗС і адказны за якасць паліва. Яму там адказалі: "Лукашэнка", мабыць, пажартавалі. Менавіта таму 20 лістапада, адчуўшы пах няякаснага бензіну, мужчына напісаў фразу ў кнізе скаргаў і прапаноў.

> *"З майго пункту гледжання, дзеючы прэзідэнт такі добры гаспадарнік, што, магчыма, ён мог бы пракантраляваць якасць бензіну. Не магу нават сказаць, чаму менавіта такое словазлучэнне падабраў",* - адзначыў абвінавачаны.

У той момант не разумеў, што абражае прэзідэнта. У зробленым раскайваецца.

У судзе дапыталі сведак. Аператарка АЗС **Вікторыя Чычкан** знаходзілася ў той дзень на дзяжурстве. Вячаслаў Кульба заходзіў адзін, здзяйсняў куплю, але не можа ўспомніць якую менавіта. Па першым патрабаванні перадала кнігу скаргаў і прапаноў абвінавачанаму, удакладніўшы, ці ёсць нейкія скаргі адносна яе працы аператарам. Мужчына сказаў, што скаргаў няма. Пасля гэтага Вікторыя перадала інфармацыю кіраўніцтву па ўстаноўленым рэгламенце - цалкам перанесла змесціва скаргі і свае тлумачэнні ў спецыяльны бланк. Ці быў абвінавачаны ў стане алкагольнага ап'янення - не можа сказаць, бо працуе ў масцы, а паміж ёй і спажыўцамі знаходзіцца ахоўны экран. Таксама патлумачыла, што не можа ведаць, у чый менавіта адрас было пакінута выказванне і не ў праве даваць маральную ацэнку запісу.

Наступнай выступіла яшчэ адна аператарка АЗС **Таццяна Фурс**, якая прысутнічала на працы, займалася іншымі справамі. Кажа, што абвінавачаны паводзіў сябе адэкватна, прыйшоў і заплаціў за паліва, Стаў камунікаваць з яе калегай, а пасля чаго гучна сказаў: "Дайце кнігу скаргаў". Агрэсіўна сябе не паводзіў. Што пісаў і чаму прасіў кнігу скаргаў - не ведае. Пасля таго, як абвінавачаны сышоў, прачытала пакінуты запіс, была здзіўленая, а Вікторыя Чычкан запоўніла бланк. Да каго быў адрасаваны дадзены запіс, і як яна яго разумела - не можа сказаць; патлумачыла, што іх справа была перапісаць і адправіць бланк кіраўніцтву.

Сястра абвінавачанага **Ірына Кульба** растлумачыла суду, што бачыла, як брат нешта піша, але не ўдакладняла ў яго дэталяў, не абмярковалі нічога з гэтай нагоды. Пра запіс і яго змесціва даведалася на допыце ў следчага. Прычыны ўчынку брата растлумачыць не можа, але ўзгадвае гісторыю з няякасным бензінам у Расіі, якую распавядаў Вячаслаў.

На аўтазапраўцы ёсць відэакамеры, пра што маюцца адпаведныя інфармацыйныя паведамленні. У судзе прагледзелі відэазапісы з іх.

У спрэчках бакоў дзяржабвінаваўца прасіла суд прызнаць Вячаслава Кульбу вінаватым у здзейсненым злачынстве па ч. 1 арт. 368 КК і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе двух гадоў «хатняй хіміі».

Увесь судовы працэс заняў адзін гадзіну.

У выніку суд прызнаў Вячаслава Кульбу вінаватым у абразе прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прызначыў пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі без накіравання ў выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін два гады.**

Праваабарончы цэнтр «Вясна» з дапамогай валанцёраў адсочваў гэты судовы працэс.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сняг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY